АПО

ШТОМЕСЯЧНЫ
НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫ
ЧАСОПІС

# НАРОДНАЯ Асвета

**СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ**
ПРАЕКТАВАННЕ ПРАФЕСІЯНАЛЬНАЙ КАР'ЕРЫ БУДУЧЫХ ПЕДАГОГАЎ

**АДМІНІСТРАЦЫЙНЫ ПАРТФЕЛЬ**
ТЭХНАЛОГІЯ АДКРЫТАЙ ПРАСТОРЫ Ў МЕТАДЫЧНАЙ РАБОЦЕ ШКОЛЫ

**БАНК МЕТОДЫК І ТЭХНАЛОГІЙ**
МАЙСТАР-КЛАС «АД ПРАДУКЦЫЙНАГА ЧЫТАННЯ – ДА ГРАМАТНАГА ЧЫТАЧА»

**ПЕДАГАГІЧНАЯ АСАМБЛЕЯ**
КЛАСНЫ КІРАЎНІК – КААРДЫНАТАР ВЫХАВАЎЧАГА ПРАЦЭСУ

**ЛЮСТЭРКА ПРАФЕСІЙНАЙ АДУКАЦЫІ**
ПСІХАЛАГІЧНАЯ МАЙСТЭРНЯ «САКРЭТЫ ЭФЕКТЫЎНАЙ КАМУНІКАЦЫІ»

12
2021

# Прафарыентацыйны дзіцяча-бацькоўскі сход «Дарогі, якія мы выбіраем»

## Актывізацыя ўдзелу бацькоў у прафесійным вызначэнні дзяцей

**Т. М. Астроўская,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст»
СШ № 3 г. Мінска



**Выбар будучай прафесіі часта выклікае цяжкасці ў сучасных старшакласнікаў. Таму натуральна, што адным з ключавых напрамкаў дзейнасці класнага кіраўніка з'яўляецца тэарэтычна абгрунтаваная і практычна накіраваная работа па прафарыентацыі. Эфектыўнай яна можа быць толькі пры ўмове прадуктыўнага супрацоўніцтва з бацькамі вучняў.**

Прапануем вашай увазе **прафарыентацыйны дзіцяча-бацькоўскі сход «Дарогі, якія мы выбіраем»**.

**Мэты:** актывізацыя ўдзелу бацькоў у прафесійным самавызначэнні сваіх дзяцей; вызначэнне арыенціраў для выбару прафесіі падлеткамі.

**Задачы:**

- спрыяць пашырэнню педагагічнай дасведчанасці бацькоў у складаных пытаннях прафарыентацыі;
- матываваць вучняў да свядомага самавызначэння ў выбары прафесіі.

**Абсталяванне:** відэаапаратура, карткі з прыказкамі і прымаўкамі, карткі для практыкавання «Памылкі пры выбары прафесіі», карткі для гульні «Роскід меркаванняў».

**Ход мерапрыемства**

**I. Уступная частка**

*Класны кіраўнік вітае ўдзельнікаў, раздае ім карткі з тэкстам прыказак і прымавак і прапануе растлумачыць іх сэнс.*

***Варыянты прыказак і прымавак***

1. Не за сваю справу не бярыся, а за сваёю не ляніся.
2. Праца чалавека трымае і ўздымае, а гультайства псуе.
3. Рамяство піць і есці не просіць, а само корміць.
4. Не глядзі, каб скора, а глядзі, каб добра.
5. Па рабоце майстра відаць.
6. Хто працуе, той і мае.
7. Не чакай з неба дараванага хлеба.
8. Вачам страшна, а рукі возьмуць і зробяць.
9. Работа і корміць, і поіць, і вучыць.
10. Чалавек без працы – што птушка без крылаў.

**Вядучы.** Як вы думаеце, што аб'ядноўвае гэтыя назіранні, зробленыя народам? (*Адказы ўдзельнікаў.*) Так, тэма працы, адносін да яе, да выбару прафесіі. Нашым дзецям таксама хутка трэба будзе рабіць адзін з самых важных у жыцці выбараў. Тэме прафесійнага самавызначэння прысвечана і сённяшняя сустрэча.

**II. Асноўная частка**

**Вядучы.** Сучасныя бацькі ставяцца да выбару прафесіі сваімі дзецьмі як да агульнасямейнай справы. І гэта ўвогуле правільна. Але часам на гэтай глебе здараюцца і сур'ёзныя канфлікты. Як іх пазбегнуць? Слова – педагогу-псіхолагу.

- **Міні-лекцыя педагога-псіхолага**

*Педагог-псіхолаг раіць бацькам аб'ектыўна ацэньваць магчымасці, псіхалагічную*

*падрыхтаванасць да той або іншай дзейнасці, памкненні і інтарэсы сваіх дзяцей, называе крыніцы, дзе можна атрымаць навукова абгрунтаваную інфармацыю па прафдыягностыцы, прафасвеце і прафкансультацыі (кнігі, часопісы, сайты), паведамляе каардынаты цэнтраў прафарыентацыі.*

**Вядучы.** Ёсць тры шляхі выбару прафесіі. Першы – аб'ектыўна вывучаць свае схільнасці, магчымасці, уласцівасці нярвовай сістэмы, мыслення, памяці, увагі і вызначаць на гэтай падставе справу жыцця. Другі – ісці, што называецца, усляпую, выпрабоўваць сябе ў розных сферах дзейнасці. Але перш чым пачаць гаворку пра трэці шлях выбару прафесіі, прапаную вучням выканаць наступнае практыкаванне.

❑ **Практыкаванне «Паляванне на памылкі»**

Класны кіраўнік прапануе кожнаму з вучняў пазнаёміцца са спісам «Памылкі пры выбары прафесіі» (на картках) і адзначыць тры памылкі, якія падаюцца яму найбольш небяспечнымі (пры гэтым можна кансультавацца з бацькамі). Па ходзе адказаў дзяцей класны кіраўнік запісвае на дошцы *нумары памылак*.

1. *Атаясамліванне вучэбнага прадмета з прафесіяй.*

Выбіраючы прафесію, трэба помніць, што школьны прадмет – гэта не прафесія, а галіна ведаў. Прафесія – гэта род працоўных дзеянняў, дзе могуць быць прыменены веды па тым або іншым прадмеце.

2. *Выбар прафесіі «за кампанію».*

У сяброў могуць супадаць інтарэсы, магчымасці. Але часта бывае так, што прафесія больш падабаецца і падыходзіць таму, хто яе выбірае, а не таму, хто становіцца «кампаньёнам».

3. *Захапленне знешнім бокам прафесіі.*

Выбіраючы прафесію, неабходна даведацца як мага больш пра змест працы, якой прыйдзецца займацца, а таксама пра яе пазітыўныя і негатыўныя бакі.

4. *Выбар прафесіі па прычыне яе прэстыжнасці.*

Мода хутка змяняецца, і важна, каб прафесія, на набыццё якой вы затрацілі час, сілы, сродкі, не аказалася выбранай толькі з-за прэстыжнасці, насуперак вашым прыродным здольнасцям і сапраўдным інтарэсам.

5. *Перакананне, што бываюць прафесіі творчыя і нятворчыя.*

Бываюць не нятворчыя прафесіі, а нятворчыя людзі. Так, праца толькі тады прыносіць задавальненне, калі яна становіцца творчасцю, але творчасць можна праяўляць у любой галіне дзейнасці.




6. *Няведанне ці недаацэнка сваіх фізіялагічных асаблівасцей.*

Перш чым зрабіць канчатковы выбар, трэба абавязкова атрымаць кансультацыю ўрача, даведацца, ці дазваляюць твае фізіялагічныя асаблівасці, стан твайго здароўя займацца пэўным відам дзейнасці.

7. *Няўменне суаднесці ўласныя здольнасці з патрабаваннямі пэўнай прафесіі.*

Выбіраючы прафесію, трэба сумленна і аб'ектыўна прааналізаваць, што ў цябе лепш за ўсё атрымліваецца, даведацца (праз інтэрнэт, кансультацыі са спецыялістамі), валоданне якімі фізічнымі, псіхалагічнымі, сацыяльнымі, інтэлектуальнымі якасцямі абавязковае для прадстаўнікоў гэтай прафесіі.

8. *Састарэлыя ўяўленні пра характар і ўмовы працы ў той або іншай сферы вытворчасці, культуры, навукі.*

У нашым жыцці ўсё хутка змяняецца. Змяняюцца і прафесіі. З кожным годам розныя галіны народнай гаспадаркі папаўняюцца сучасным абсталяваннем, што, з аднаго боку, паляпшае ўмовы працы людзей, а з другога – патрабуе ад іх намаганняў па якасным і хуткім іх асваенні.

9. *Адсутнасць запасных варыянтаў пры выбары прафесіі.*

Усё ў жыцці прадугледзець немагчыма. Вы можаце не прайсці па конкурсе, расчаравацца ў пэўнай спецыяльнасці. Таму вельмі важна прадумаць дадатковы варыянт прафесійнага самавызначэння.

*Арганізуецца абмеркаванне.*

**Вядучы.** І нарэшце – пра трэці шлях выбару прафесіі. Гэта намер авалодаць справай сваіх бацькоў, а магчыма, нават дзядоў і прадзедаў. Гутарка ідзе аб працоўных дынастыях.

*Выступленне прадстаўніка сямейнай дынастыі.*

❑ **Гульня «Роскід меркаванняў»**

Вядучы прапануе вучням і бацькам выцягнуць карткі з пачаткам фразы і закончыць яе.

***Варыянты фраз для вучняў***

- ✓ У вольны ад вучобы час я люблю...
- ✓ Больш за ўсё мне падабаецца...
- ✓ Я магу дасягнуць поспеху у...
- ✓ На мой прафесійны выбар можа паўплываць...
- ✓ Я ўпэўнены, што хачу...
- ✓ Я ведаю, што буду...
- ✓ Каб стаць..., мне трэба...
- ✓ Якасці майго характару, якія могуць абцяжарыць мой выбар, – гэта...
- ✓ Мне падабаюцца прафесіі...
- ✓ У мяне ёсць здольнасці да...
- ✓ Стан майго здароўя і мае фізічныя асаблівасці дазваляюць...

***Варыянты фраз для бацькоў***

- ✓ Дапамагаць дзецям у выбары прафесіі павінны...
- ✓ Пачынаць выбіраць прафесію трэба...
- ✓ Выбар прафесіі залежыць ад...
- ✓ Вельмі важна, каб на кожным этапе прафесійнага самавызначэння...
- ✓ Адносіны бацькоў да выбару прафесіі дзіцяці павінны праяўляцца у...
- ✓ Некаторыя бацькі...
- ✓ Я б хацеў (хацела), каб мой сын (дачка) пры выбары прафесіі...
- ✓ Вырашальны фактар дакладнасці і ўсвядомленасці выбару прафесіі – гэта ...

*Арганізуецца абмеркаванне.*

**III. Заключная частка**

*Гучыць песня «Дарогай дабра» (сл. Ю. Энціна, муз. М. Мінькова).*

Класны кіраўнік прапануе і дзецям, і дарослым падзяліцца ўражаннямі ад сустрэчы і ўручае кожнай сям'і памяткі «Парады бацькам».

***Памятка «Парады бацькам»***

1. Дайце свайму дзіцяці права выбару будучай прафесіі.



2. Абмяркоўвайце разам з падлеткам магчымыя «за» і «супраць» выбранай ім прафесіі.

3. Разглядайце выбар прафесіі не толькі з пазіцыі матэрыяльных выгод, але і з пазіцыі маральнага задавальнення.

4. Улічвайце разам з падлеткам пры выбары ім будучай прафесіі яго асобасныя якасці.

5. Арганізуйце кансультацыю са спецыялістам у выпадку вашых рознагалоссяў з сынам (дачкой) адносна яго (яе) будучай прафесіі.

6. Не давіце на падлетка, калі ён адмаўляецца асвойваць прафесію, якую лічыце найбольш прымальнай для яго. Гэта можа стаць прычынай сур'ёзнага канфлікту і не паспрыяе самарэалізацыі маладога чалавека.

7. Падтрымлівайце сваё дзіця ў яго імкненні да мары – дапамажыце знайсці адпаведны гурток, студыю, падбярыце неабходную інфармацыю, пазнаёмце з людзьмі абранай падлеткам прафесіі.

8. Не дакарайце сына (дачку), калі яго (яе) выбар аказаўся памылковым. Лепш разам вызначце план дзеянняў, накіраваных на выпраўленне памылкі.

9. Памятайце: дзеці пераймаюць адносіны да працы, да прафесіі ў сваіх бацькоў.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Белянина, О. А.** К вопросу психологической поддержки юных людей в их профессиональном самоопределении / О. А. Белянина // Психологическое сопровождение личности в процессе ее профессионального самоопределения. – Пенза: Приволжский Дом знаний, 2008.
2. **Павличенко, Е.** Психолого-педагогическое сопровождение образовательного процесса / Е. Павличенко // Воспитание школьников. – 2006. – № 1.
3. **Профориентация в школе** / сост. С. В. Тарасевич, Н. А. Шалима, О. А. Купревич, Е. Н. Пастушкова. – Минск: Красико-Принт, 2007.
4. **Рогов, Е. И.** Выбор профессии: становление профессионала / Е. И. Рогов. – М.: ВЛАДОС, 2003.